СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 ЛІПЕНЯ 2017 г. АЎТОРАК №140 (28504)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Адчувальныя сельгастаравары ЕАЭС**



**Тульскі пернік і беларускае павідла**



**Турыстам дазволяць збіраць трактары**

СТАР. 13

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Галіна СЦЕПУРЭНКА, дырэктар Мінскага гарадскога тэрытарыяльнага фонду дзяржаўнай маёмасці («Мінскгармаёмасць»):**

*«Незапатрабаваныя ў арандатараў мансардныя і падвальныя памяшканні ў Мінску плануецца выстаўляць на продаж. Такія аб'екты неаднаразова прапаноўваліся ў арэнду, але застаюцца незапатрабаванымі з-за неабходнасці вялікіх укладанняў. У цяперашні час фарміруецца спіс для рэалізацыі права ўласнасці на іх. Такія меры дазволяць уцягнуць іх у гаспадарчы абарот. Акрамя таго, у сталіцы пашыраць спіс памяшканняў для перадачы ў бязвыплатнае карыстанне пад стварэнне працоўных месцаў.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.07.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9440 | ▲ |
| Еўра | 2,2631 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0325 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0753 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Практыка па гісторыі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Студэнткі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта вядуць раскопкі на тэрыторыі Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра, каля сцен аднаго з найстаражытнейшых храмаў Беларусі.

■ Надвор'е

## Клімат у нас такі?

### Мінулыя красавік і май у Беларусі сталі самымі халоднымі за пасляваенны час

**Пры гэтым тэмпература паветра ў першыя два месяцы лета знаходзілася на ўзроўні, блізкім да нормы. Пра гэта расказала начальнік аддзела клімату Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Алена КАМАРОЎСКАЯ. На сустрэчы з журналістамі сіноптыкі падвялі метэаралагічныя вынікі паўгоддзя, а таксама расказалі, якім будзе канец лета ў Беларусі.**

Паводле слоў Алены Камароўскай, у цэлым першае паўгоддзе можна характарызаваць як цёплае. Сярэдняя тэмпература паветра склала 5,1 градуса — гэта на 1,7 градуса вышэй за кліматычную норму. А, напрыклад, самай цёплай за ўсю гісторыю назіранняў была першая палова 1989 — тады сярэдняе значэнне было на ўзроўні 7,4 градуса вышэй за нуль. Найбольш значны ўплыў на гэты паказчык сёлета аказалі надзвычай цёплыя люты і сакавік. Пры гэтым яшчэ ў першай палове мая ў Беларусі выпадаў снег. 1, 10 і 11 чысла гэтага месяца снежнае покрыва таўшынёй ад 1 да 6 сантыметраў фіксавалася ў розных рэгіёнах краіны — гэта рэкордна позні паказчык.

— У сваю чаргу, у сярэдзіне красавіка — сярэдзіне мая ў Беларусі ўсталёўвалася анамальна халоднае надвор'е, — адзначыла спецыяліст. — Сярэдняя тэмпература была на 3—3,5 градуса ніжэй за кліматычную норму. Так халадна ў гэты час у нас не было ніколі ў пасляваенны перыяд. Таксама ў пачатку мая ў Беларусі нярэдка фіксаваліся замаразкі. Так, 10—12 чысла гэтага месяца і ў паветры, і на паверхні зямлі тэмпература дасягала ад 0 да мінус 5 градусаў. Па аб'ёмах ападкаў першае паўгоддзе было блізкім да нормы.

Таксама Алена Камароўская распавяла, калі чакаць прыходу ў Беларусь сапраўднага лета. Працяглае добрае надвор'е чакаецца ў краіне ў першыя дні жніўня.

СТАР. 3

■ Памяць

## ВЯРТАННЕ ПРАЗ 76 ГАДОЎ

### На аднаго невядомага з тысяч герояў Дняпроўскага рубяжа стала менш

**Гэты сон яна бачыць кожны раз, калі ў яе дом прыходзяць навіны. Калі добрыя — вада светлая, калі наадварот — цёмная. Гэтым разам яна сніла ваду, якая цячэ на яе дом, але не магла зразумець, якога яна адцення. І не светлая, і не цёмная. Хутка патэлефанавалі калегі і паведамілі: збірайся ў Быхаў, там знайшлі твайго дзеда...**



Марына ЛУХТУРА: «Жменьку пяску з магілы Івана завязу на радзіму».

### ВЕСТКА З МІНУЛАГА

— Якога дзеда? Яны ж усе памерлыя, — расказвала Марына Лухтура пра сваю разгубленасць, калі яна даведалася, што беларускія пошукавікі знайшлі астанкі яе сваяка Івана Кірылавіча Шутава, які загінуў у 1941-м. — І толькі потым, калі паразмаўляла з маці, даведалася, што вестка пра бабулінага роднага дзядзьку. У маі 41-га ён пайшоў у армію, а хутка пачалася вайна і прыйшло паведамленне, што ён знік без вестак.

СТАР. 4

Да 100-годдзя «Звязды» засталося 15 дзён

## На ўсе 100!!!

**За без дваццаці дзён векавую гісторыю звяздоўцы не страцілі энтузіязму і азарту! Мы запрашаем вас, шаноўныя чытачы, вашых блізкіх і сяброў на актыўнае свята, дзе вы зможаце паспаборнічаць у гіравым спорце і варкаўце, паўдзельнічаць у майстар-класах ад рэкардсмена Гінеса (аўтара больш як 100 сілавых рэкордаў!) Вячаслава Харанекі і ўбачыць гульню найлепшага міні-футбольнага клуба краіны «Сталіца»!**

**Вас чакае мора спартыўнага драйву, падарункі ад газеты «Звязда», аўтограф-сесія са знакамітымі спартсменамі, фотазона, прыемная музыка і сяброўская атмасфера!**

**Свята адбудзецца ў суботу 29 ліпеня на спартыўнай пляцоўцы сталічнага Ліцэя №1 (праспект Газеты «Звязда», 6А).**

**Пачатак у 11.00. УВАХОД ВОЛЬНЫ.**